View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



**Апублікавана:** Вялікі А.Ф., 60-летия образования Гродненской области: материалы международной научн.теорет. конф, 3-4 марта 2004 г./ Гродн гос. ун-т. – Гродно, 2004. – С.342-347.
**Ключавыя словы:** Гродзенская вобласць, Польшча, Заходняя Беларусь, райпрадстаўніцтва, перасяленне, палякі, беларуска-польскае пагадненне аб перасяленні, польскае падполле, Армія Краёва.

## Перасяленне польскага насельніцтва з Гродзенскай вобласці ў Польшчу. 1944-1946 гг. Прычыны. Ход. Вынікі.

Перасяленне палякаў з Гродзенскай вобласці ў Польшчу, што адбывалася ў 1944-1946 гг. на аснове беларуска-польскага пагаднення аб перасяленні, заключанага 9 верасня 1944 г. і дадатковы пратакол да яго ад 25 лістапада 1945 г. з'яўляецца адной з найбольш складаных, неадназначных падзей у гісторыі Гродзеншчыны. Улік, рэгістрацыя і адпраўка палякаў у Польшчу. У Гродзенскае райпрадстаўніцтва ўваходзілі 10 раёнаў - Гродзенскі, Скідзельскі, Сапоцкінскі, Лідскі, Жалудоцкі, Шчучынскі, Радуньскі, Васілішкаўскі, Воранаўскі, а таксама г. Гродна.

Рэгістрацыя вызначыла сукупнасць фактараў, якія вымушалі палякаў ад'язджаць з Беларусі. Найбольш значнымі з'яўляліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, этнічныя, канфесійныя, міжнародныя, роднасныя ды іншыя. Усе яны дзейнічалі адначасова як па асобку, так і сукупна.

Для аднаасобнага сялянства непрымальнай стала палітыка савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі, скіраваная стварэнне калгасна-саўгаснай сістэмы, высокія стаўкі падаткаў на аднаасобніка, штогадовыя дзяржаўныя пазыкі, прымусовыя аргнаборы на працу па-за межы рэспублікі і г.д. Нягледзячы на той факт, што ў 1944-1945 гг. прымусовая калектывізацыя яшчэ актыўна не праводзілася, аднаасобнік адчуваў яе непазбежнасць. Так, Гродзенскі РК КП(б)Б паведамляў у Гродзенскі абкам партыі (ліпень 1945 г.), што "на выезд у Польшчу запісваюцца грамадзяне, якія разумеюць, што на тэрыторыі савецкай дзяржавы будуць ствараццца калгасы, а яны не жадаюць калгаснага ладу"[1, л. 92]. Аднаасобнае сялянства пры рэгістрацыіі адкрыта заяўляла аб сваім нежаданні працаваць у калгасах. Гродзенскі абкам партыі паведамляў у ЦК КП(б)Б (снежань 1945 г.), што "70% насельніцтва вёсак Асновічы, Громкі, Прудзяны, Лянцішкі, Грудзішкі Васілішкаўскага раёна зарэгістравалася на выезд. Прычына – незадаволенасць мерапрыемствамі савецкай улады [2, л. 67].

Жаданне выехаць у Польшчу выказала значная частка работнікаў прамысловасці, транспарту. Так, з 41 рабочага Гродзенскага велазборачнага завода ў 1945 г. выехала у Польшчу 25 работнікаў і 9 зарэгістравалася на выезд. У Лідзе са 146 рабочых і служачых завода сельскагаспадарчага

машынабудавання - 55, са 100 рабочых і служачых цвікавага завода - 90, са 102 піваваранага - 60 зарэгістраваліся на выезд у Польшчу[3, л. 102].

Разам з рабочымі выказала жаданне перасяліцца значная колькасць інтэлігенцыі. Так, з дзіцячай бальніцы Гродна, у якой працавала 24 работнікі, на выезд зарэгістравалася 13 работнікаў, з інфекцыйнай з 44, адпаведна - 24, першай гарадской з 49 адпаведна 22. З 71 работніка аптэк Гродзенскай вобласці 35 зарэгістравалася на выезд у Польшчу. У выніку ад'езду медработнікаў у 1945 г. зачыніліся аптэкі ў Шчучынскім, Жалудоцкім, Сапоцкінскім раёнах [3, л. 101].

Жаданне выехаць у Польшчу выказала амаль што палова настаўнікаў Гродзеншчыны. З 1640 настаўнікаў у 1944/45 вучэбным годзе 765 лічылі сябе палякамі. З іх 706 зарэгістравалася на выезд у Польшчу. Гродзенскі абкам партыі летам 1945 г. адзначаў, што "на працягу 1944/1945 вучэбнага года па няпоўных дадзеных у Польшчу выехала 228 настаўнікаў, яшчэ 250 зарэгістравалася на выезд. У Гродна напачатку 1945/1946 вучэбнага года налічвалася 104 настаўнікі-палякі. На 1 чэрвеня 1945 г. іх засталося 68, з якіх 45 зарэгістравалася на выезд. У Сапоцкінскім раёне з 68 настаўнікаў 30 зарэгістравалася на выезд у Польшчу. [ ].

Значная частка палякаў выязджала з-за таго, што ў Польшчы знаходзіліся іх родныя, сваякі, блізкія. Так, жыхар г.Ліда Б.Крывашэй так патлумачыў свае жаданне пераехаць у Польшчу: "Паведамляю, што большасць маіх родных знаходзіцца ў цяперашні час у Польшчы і таму жадаю далучыцца да іх".[ ].

Частка польскага насельніцтва выязджала ў Польшчу спадзяючыся на лепшыя ўмовы жыцця. Так, рабочы-паляк саўгаса "Станіславава" Гродзенскага раёна Б.Шагун у адказ на пытанне ўпаўнаважаннага па перасяленню, што яго вымушае пераязджаць заявіў: "Я працаваў у памесці "Станіслававa" атрымоўваў 72 пуды хлеба ў год, 30 злотых штомесяц і мне памешчык даваў морг зямлі. Любыя боты я мог купіць за 15 рублеў, а зараз я атрымоўваю 140 рублеў у месяц, 500 грам хлеба ў дзень і хаджу босв. Вось чаму я пераязджаю ў Польшчу"[ ].

На перасяленне істотна ўплываў фактар польскага падполля. Дзейнасць падполля ў час перасялення магчыма падзяліць на два перыяды, якія кардынальна адрозніваліся адзін ад аднаго. Першы перыяд пачаўся з моманту падпісання беларуска-польскага пагаднення (9 верасня 1944 г.) і працягваўся да Крымскай канферэнцыі. Ён характарызуецца тым, што лонданскі ўрад і падполле не пакідалі надзеі на ўсталяванне давераснёўскай ўсходняй мяжы Польшчы. У гэты перыяд падполле скіроўвае дзейнасць на забарону палякам рэгістравацца і выязджаць у Польшчу. Наколькі моцным быў гэты фактар, сведчыць данясенне райпрадстаўніка СНК БССР з Гродна (снежань 1944 г.), у якім паведамлялася, што "абвесткі ў горадзе вывешваліся 4 разы і раніцай нічога не заставалася. Нават каля памяшкання камісіі абвесткі зрываліся. Усе польскае насельніцтва знаходзіцца пад вялікім уздзеяннем польскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

белабандытаў, якія гаварылі палякам, што нікуды не трэба ехаць, бо тут будзе Польшча"[ ]. Частка палякаў на самай справе вымушана была падпарадкавацца патрабаванням падполля. Паслядоўнае выкананне падполлем менавіта такой устаноўкі адзначае і англійскі гісторык К.Сворд, які пісаў, што "польскі ўрад у Лондане рэкамендаваў Арміі Краёвай рабіць усе магчымае, каб спыніць масавы ад'езд насельніцтва ў гэты час"[ ]. Пасля Крымскай канферэнцыі, зразумеўшы, што межы канчаткова вызначаны і пераглядацца не будуць, тактыка падполля мяняецца. З вясны 1945 г. падполле наадварот прыкладае намаганні, каб усе палякі рэгістраваліся і выязджалі ў Польшчу.

Сведчаннем таго, што тэрор з боку падполля з'яўляўся адной з галоўных прычын рэгістрацыі палякаў на выезд, з'яўляецца даведка "Аб фактах бандытызму ў Гродзенскім раёне", якую Гродзенскі РК КП(б)Б накіраваў 28 красавіка 1945 г. у ЦК КП(б)Б. У ей падкрэслівалася, што "у выніку дзейнасці бандыцкіх груп, запалохвання насельніцтва ў Прывалкаўскім сельсавеце Гродзенскага раёна ўсе насельніцтва запісалася на выезд у Польшчу[ ]. Асабліва моцны прымус з боку падполля назіраўся у Воранаўскім, Радуньскім, Лідскім, Шчучынскім раёнах. Гродзенскае райпрадстаўніцтва адзначала, што ў гэтых раёнах групы ўзброеных "белабандытаў" абыходзілі хаты палякаў і загадвалі тым, хто не запісаўся на выезд, тэрмінова рэгістравацца[ ]. Наколькі ўплывовым быў гэты фактар, сведчыць прыклад Воранаўскага раёна. У даведцы ЦК КП(б)Б "Аб стане працы Воранаўскага РК КП(б)Б Гродзенскай вобласці па перасяленню грамадзян польскай нацыянальнасці з БССР у Польшчу", (чэрвень 1945 г.) адзначалася, што "па ўліку польскага ўпаўнаважанага у Воранаўскім раёне зарэгістравалася на выезд у Польшчу 5812 гаспадарак, у якіх налічвалася 22 217 чалавек"[12, С. 132]. Гэта тлумачылася тым, што "рэгістрацыя амаль усяго насельніцтва раёна для выезда з БССР у Польшчу з'явілася следствам слабай масава-палітычнай працы сярод насельніцтва з боку раённай партыйнай арганізацыі, уплыву антысавецкай агітацыі польскіх нацыяналістаў, а галоўным чынам, як вынік запалохвання насельніцтва з боку польскіх нацыяналістычных банд". Аналагічная сітуацыя назіралася і ў іншых раёнах Гродзенскай вобласці.

1 мая 1945 г., у адпаведнасці з беларуска-польскай дамоўленасцю ад 26 студзеня 1945 г., рэгістрацыя часова была прыпынена. У працэсе перасялення ўзнікла "паўза", якая дазваляе падвесці папярэднія вынікі перасялення. За час з кастрычніка 1944 г. па 1 мая 1945 г. на выезд у Польшчу па ўсіх раёнах Гродзенскай вобласці зарэгістравалася 32 702 гаспадаркі, якія налічвалі 98 985 грамадзян[12, С. 158]. Усе раёны вобласці магчыма падзяліць на тры групы, якія адрозніваліся высокай, сярэдняй і нізкай ступенню рэгістрацыі. Так, у першую групу ўвайшлі Лідскі раён - 8369 сямей, якія налічвалі 25 107 чалавек. Гродзенскі - адпаведна 7173 і 23 459, Воранаўскі - 6642 і 20261 і г. Гродна - 7492 і 19 034. У другую - Шчучынскі раён - 4422 і 15376, Радуньскі - 3092 і 11257, Жалудоцкі - 3090 і 8739. У трэцюю - Сапоцкінскі - 2896 і 11 693, Васілішкаўскі - 2303 і 6702, Скідзельскі - 1600 і 5598[ ]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачатак 1946 г. абвастрыў сітуацыю з перасяленнем. Гэтаму паспрыяла пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 8 студзеня 1946 г. "Аб фактах масавага запісу насельніцтва на выезд у Польшчу па Ваўкавыскаму і Радуньскаму раёнах Гродзенскай вобласці". На бюро ЦК КП(б)Б адзначалася, што "за дзесяць дзён студзеня (1946 г.) у Ваўкавыскім раёне па выбарачнаму участку (у гэты час праходзілі выбары ў Вярхоўны Савет БССР) № 21 з 431 выбаршчыка 400 згадзіліся на выезд у Польшчу, на выбарчым участку № 26 гэтага ж раёна з 686 выбаршчыкаў на выезд у Польшчу згадзілася 636 чалавек. Насельніцтва вёскі Пескі Нарачанскага сельсавета ў колькасці 120 гаспадарак поўнасцю запісалася на выезд"[ ]. На пачатку студзеня 1946 г. у сапраўднасці адбыўся масавы запіс польскага насельніцтва на выезд у Польшчу. Як паведамляў прадстаўнік Гродзенскага райпрадстаўніцтва У. Пуцята Галоўнаму прадстаўніку СНК БССР, жадаючых запісацца на выезд было столькі, што "апошнія дні рэгістрацыі вылiлiся ў цэлы працэс. У камісіі не вытрымлівалі ні вокны, ні дзверы. Узброеная група міліцыі не змагла забяспечыць парадку. Натоўп ламаўся дзень і ноч". Усяго з 1 снежня 1945 г. па 15 студзеня 1946 г., па Гродзенскаму райпрадстаўніцтву запісалася на выезд 11 429 гаспадарак агульнай колькасцю 41 136 чалавек[ ]. Улічваючы гэтае бюро ЦК КП(б)Б абавязала Гродзенскі абкам партыі тэрмінова камандзіраваць у Васілішкаўскі і Радуньскі раёны адказных партработнікаў з мэтай спынення запісу насельніцтва. Галоўнаму Прадстаўніку СНК БССР У.Царуку загадвалася ўзяць пад асабісты кантроль ход рэгістрацыі і спыніць практыку запісу па вусных заявах.

Для змяншэння колькасці жадаючых ад'ехаць у Польшчу партыйныя і савецкія ўлады патрабавалі ад палякаў, асабліва ад сялян, прадастаўлення даведак аб выкананні планаў дзяржпаставак сельскагаспадарчай прадукцыі, лесанарыхтовак, выплаты ўсіх падаткаў. Такія дзеянні раённых уладаў былі санкцыянаваны абласным кіраўніцтвам. Так, на нарадзе у Гродзенскім абкаме партыі 24 студзеня 1946 г, першы сакратар абкама партыі П.Калінін і старшыня аблвыканкама П.Ратайка далі вусную дырэктыву сакратарам райкамаў партыі і старшыням райвыканкамаў не выдаваць зарэгістраваным эвакадакументы, пакуль яны не выканаюць усе неабходныя дзяржпастаўкі і плацяжы[ ].

У чэрвені 1946 г. амаль двухгадовая праца па перасяленню была закончана. Агульныя тэндэнцыі, якія склаліся з пачаткам перасялення, захаваліся з нязначнымі змяненнямі. Так, калі па стану на 1 мая 1945 г. у першую групу райпрадстаўніцтваў, у якіх зарэгістравалася найбольшая колькасць насельніцтва, уваходзілі Лідскі, Гродзенскі, Воранаўскі раёны, то па стану на 15 чэрвеня 1946 г. гэтая група раёнаў захавала "лідарства". Так, у Лідскім раёне зарэгістравалася на выезд 8369 сямей, якія налічвалі 25 107 чалавек, у Гродзенскім адпаведна - 7173 і 23 459, Воранаўскім - 6642 і 20 261 і Гродна - 7492 і 19 034. У другую групу ўвайшлі Шчучынскі - 4492 і 15 378, Радуньскі - 3092 і 11 251 і Жалудоцкі - 3090 і 8739. У трэцюю - Сапоцкінскі -

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2896 і 11693, Васілішкаўскі - 2 303 і 6702, Скідзельскі - 1600 і 5598[ ]. Аднак паміж лікам зарэгістраваных і тымі, хто выехаў у Польшчу, існавала істотнае адрозненне. Па розных прычынах адмовілася ад перасялення 29 278 сямей, якія налічвалі 104 670 чалавек. Толькі 72 300 чалавекі назаўсёды пакінулі Гродзеншчыну і пераехалі ў Польшчу[ ]. Сярод іх палякі склалі 98%, яўрэі - 1,6%, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей - 0,4%. Па роду заняткаў агульная колькасць перасяленцаў падзялялася наступным чынам: сялян - 32,6%, рабочых - 9,8%, інтэлігенцыі - 24,7%, працаўнікоў аховы здароўя - 0,3%. Дзеці і падлеткі да 15 гадовага ўзросту склалі 5,6%, дарослыя - 94,4%. На 1945 г. прыходзіцца 59,4% перасяленцаў, на 1946 г. - 40,2% і на 1947 г. - 0,4%.

15 чэрвеня 1946 г. афіцыйна скончыўся тэрмін перасялення, аднак у заходніх абласцях БССР заставалася яшчэ пэўная колькасць грамадзян, якія ў выніку розных абставін не змаглі пераехаць у Польшчу. Іх рэгістрацыя праводзілася ў індывідуальнам парадку ў Баранавічах і Гродна да 31 снежня 1946 г.

Перасяленне палякаў з Гродзеншчыны ў Польшчу ў 1944-1946 гг. ажыццяўлялася ў складаных абставінах ваеннага і пасляваеннага развіцця вобласці. У выніку дзесяткі тысяч палякаў пераехалі на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Агульная колькасць зарэгістраваных у Гродзенскай вобласці склала 142 439 чалавек. Аднак выехаць у Польшчу змагло звыш 72 000 чалавек. Разам з колькаснымі паказчыкамі вызначыўся сацыяльны, прафесійны склад перасяленцаў. Большасць іх склала аднаасобнае сялянства, якое такім чынам выказала недавер савецкай уладзе і яе мерапрыемствам у галіне сельскай гаспадаркі. Нягнуткая палітыка савецкай улады ў адносінах да палякаў як нацыянальнай меншасці - закрыццё польскамоўных школ, культурна-асветных устаноў, касцёлаў не магла задаволіць частку інтэлігенцыі, рабочых, святароў і іншыя групы польскага насельніцтва, якія таксама перасяліліся ў Польшчу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы

1. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.140
2. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гродзенскай вобласці (ДАГА), ф.1, воп.1, спр.74
3. НАРБ, ф.4, воп.42, спр.375

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Звесткі аб колькасці польскіх грамадзян, эвакуіраваных у Польшчу з тэрыторыі Гродзенскай вобласці. Па стану на 15 чэрвеня 1946 г. На РБ, ф. 788, воп. 1, спр. 24, арк.61

| Раены вобласці | | | Па нацыянальнасці | | | | Па полу | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго эвакуіравана | Чл. сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэі | Чл. сямей | Мужчыны | Жанчыны | Дзяцей да 16 год |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гродна | 6134 | 14426 | 6033 | 14256 | 101 | 170 | 3983 | 6177 | 4266 |
| Гродзенскі | 2043 | 5462 | 2029 | 5432 | 14 | 30 | 1794 | 1797 | 1871 |
| Сапоцкінскі | 857 | 2252 | 856 | 2250 | 1 | 2 | 711 | 761 | 780 |
| Скідзельскі | 582 | 1799 | 575 | 1785 | 7 | 14 | 427 | 611 | 761 |
| Лідскі і горад | 3586 | 10276 | 3355 | 9761 | 231 | 506 | 3302 | 3617 | 3348 |
| Жалудоцкі | 753 | 1982 | 742 | 1962 | 11 | 20 | 570 | 704 | 708 |
| Шчучынскі | 1287 | 3884 | 1259 | 3840 | 28 | 44 | 1087 | 1442 | 1155 |
| Радуньскі | 773 | 2273 | 744 | 2207 | 29 | 66 | 425 | 799 | 716 |
| Васілішкаўскі | 512 | 1187 | 505 | 1177 | 7 | 10 | 1167 | 415 | 347 |
| Воранаўскі | 1248 | 3522 | 1202 | 3412 | 46 | 110 | 325 | 1212 | 1143 |
| Бераставіцкі | 413 | 1385 | 413 | 1385 | | | 535 | 452 | 608 |
| Мастоўскі | 613 | 2082 | 610 | 2074 | 3 | 8 | 593 | 694 | 853 |
| Зельвенскі | 711 | 2068 | 678 | 2000 | 33 | 68 | 2692 | 692 | 783 |
| Ваўкавыскі | 3156 | 3963 | 3142 | 8948 | 14 | 15 | 713 | 3403 | 2863 |
| Свіслацкі | 843 | 3150 | 840 | 3146 | 3 | 4 | 631 | 1010 | 1427 |
| Поразаўскі | 672 | 2416 | 671 | 2415 | 1 | 1 | | 713 | 1072 |
| **Усяго:** | **24183** | **67118** | **23654** | **66050** | **529** | **1068** | **19713** | **24299** | **23106** |

РЕПОЗІТОРЫЙ БГПУ

| Раены вобласці | Па роду заняткаў | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Рабо<br>чых | Куста<br>роў | Сялян | Служа<br>чых | Настаў<br>нікаў | Урачоў | ІТР | Свята<br>роў | Чыгу<br>начні<br>каў | Іншых |
| Гродна | 2800 | 419 | 641 | 812 | 152 | 34 | 86 | 19 | 148 | 5049 |
| Гродненскі | 503 | 149 | 1779 | 53 | 38 | 4 | | 6 | 81 | 973 |
| Сапоцкінскі | 457 | 128 | 308 | 52 | 37 | 5 | 2 | | 2 | 481 |
| Скідзельскі | 220 | 85 | 326 | 45 | 15 | 2 | | | 7 | 337 |
| Лідскі і горад | 1034 | 179 | 559 | 461 | 65 | 65 | 47 | 10 | 199 | 4300 |
| Жалудоцкі | 101 | 132 | 685 | 49 | 13 | 10 | 4 | | 19 | 261 |
| Шчучынскі | 231 | 227 | 1126 | 182 | 78 | 6 | 5 | 3 | 16 | 455 |
| Радунскі | 102 | 126 | 990 | 61 | 27 | 4 | 4 | 2 | 17 | 224 |
| Васілішкаўскі | 90 | 57 | 391 | 38 | 24 | 2 | 1 | 2 | | 235 |
| Воранаўскі | 188 | 303 | 439 | 107 | 30 | 9 | 11 | 6 | 42 | 1244 |
| Бераставіцкі | 29 | 41 | 294 | 14 | 10 | 1 | 1 | 2 | 5 | 380 |
| Мастоўскі | 223 | 112 | 183 | 41 | 21 | 2 | 8 | 1 | 12 | 629 |
| Зельвенскі | 49 | 93 | 367 | 48 | 29 | 3 | 5 | 1 | 18 | 672 |
| Ваўкавыскі | 604 | 439 | 705 | 445 | 103 | 17 | 59 | 9 | 436 | 3278 |
| Свіслацкі | 55 | 45 | 658 | 39 | 17 | 3 | 2 | 1 | 9 | 894 |
| Поразаўскі | 35 | 71 | 479 | 30 | 22 | 2 | | 2 | 3 | 700 |
| **Усяго:** | **6721** | **2606** | **9930** | **2482** | **681** | **169** | **236** | **64** | **1014** | **20109** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца №

Звесткі аб колькасці зарэгістраванных на эвакуацыю ў Польшчу польскіх грамадзян з тэрыторыі Гродненскай вобласці па стану на 15 чэрвеня 1946 г. НА РБ, ф.788, воп.1, спр.24, арк.60

| Раёны Вобласці | | | Па нацыянальнасці | | | | Па полу | | | Па роду заняткаў | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго. зарэгістрава | Чл. сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэйскіх | Чл. сямей | Мужчын | Жанчын | Дзяцей да 16 год | Сялян | Рабочых | Кустароў | Служачых | настаўнікаў | урачоў | ІТР | святароў | Цыгуначніка ў | Іншых |
| Г.Гродна | 8446 | 20566 | 8334 | 20382 | 112 | 184 | 553 | 3882 | 6131 | 731 | 3938 | 772 | 1183 | 207 | 47 | 120 | 38 | 261 | 7138 |
| Гродненскі | 7173 | 23459 | 7081 | 23306 | 92 | 153 | 6986 | 7681 | 8792 | 8831 | 1307 | 469 | 114 | 56 | 8 | 3 | 17 | 158 | 3704 |
| Скідзельскі | 1600 | 5598 | 1591 | 5580 | 9 | 18 | 1341 | 1802 | 2455 | 1273 | 528 | 181 | 82 | 22 | 5 | 7 | 4 | 7 | 1034 |
| Сапоцкінскі | 2896 | 11663 | 2894 | 11660 | 2 | 3 | 3444 | 2692 | 4527 | 2117 | 1803 | 971 | 164 | 49 | 5 | 2 | 4 | 2 | 2019 |
| Лідскі і горад | 8369 | 25107 | 8090 | 24549 | 279 | 568 | 7455 | 9485 | 8167 | 3722 | 2514 | 716 | 832 | 142 | 78 | 216 | 22 | 335 | 8363 |
| Жалудоцкі | 3090 | 8739 | 3079 | 8719 | 11 | 20 | 2397 | 2856 | 3486 | 2602 | 230 | 306 | 67 | 19 | 10 | 4 | 3 | 26 | 1986 |
| Шчучынскі | 4442 | 15378 | 4407 | 15326 | 35 | 52 | 3973 | 4846 | 6559 | 6674 | 742 | 510 | 210 | 82 | 6 | 9 | 5 | 16 | 565 |
| Радуньскі | 3090 | 11251 | 3062 | 11183 | 30 | 68 | 3670 | 3935 | 3646 | 6017 | 144 | 298 | 69 | 28 | 4 | 4 | 3 | 17 | 1021 |
| Васілішкаўскі | 2303 | 6702 | 2294 | 6690 | 9 | 12 | 2210 | 2194 | 2298 | 2490 | 505 | 260 | 83 | 28 | 3 | 1 | 6 | 1 | 1027 |
| Воранаўскі | 5642 | 20261 | 5592 | 20143 | 50 | 118 | 5921 | 6366 | 7974 | 4698 | 377 | 589 | 132 | 38 | 14 | 21 | 12 | 66 | 6340 |
| Бераставіцкі | 986 | 2820 | 968 | 2820 | | | 785 | 935 | 1100 | 771 | 71 | 145 | 14 | 17 | 2 | 3 | 3 | 9 | 685 |
| Мастоўскі | 1624 | 6515 | 1621 | 6507 | 3 | 8 | 1647 | 2182 | 2686 | 1061 | 670 | 214 | 77 | 23 | 4 | 8 | 5 | 27 | 1740 |
| Зельвенскі | 1472 | 4814 | 1432 | 4737 | 40 | 77 | 1364 | 1622 | 1828 | 1336 | 138 | 169 | 90 | 32 | 4 | 8 | 5 | 26 | 1178 |
| Ваўкавыскі | 6533 | 20200 | 6513 | 20179 | 20 | 21 | 5773 | 7088 | 7339 | 3176 | 1038 | 1027 | 545 | 93 | 26 | 63 | 13 | 546 | 6334 |
| Свіслацкі | 1500 | 5404 | 1494 | 5400 | 3 | 4 | 1267 | 1337 | 2400 | 1138 | 79 | 90 | 46 | 17 | | 5 | 2 | 27 | 1600 |
| Поразаўскі | 1382 | 4382 | 1381 | 4381 | 1 | 1 | 1251 | 1181 | 1950 | 1316 | 45 | 166 | 27 | 20 | 1 | 3 | 6 | 8 | 840 |
| Усяго: | 60550 | 192859 | 59854 | 191562 | 696 | 1297 | 55037 | 66484 | 71338 | 47953 | 14129 | 6883 | 3735 | 873 | 217 | 477 | 148 | 1532 | 45574 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца №

## Звесткі аб колькасці эвакуіраваных ў Польшчу польскіх грамадзян з тэрыторыі Гродненскай вобласці па стану на 15 чэрвеня 1946 г. НА РБ, ф.788, воп.1, спр.24, арк.61

| Раёны Вобласці | | | Па нацыянальнасці | | | | Па полу | | | | Па роду заняткаў | | | | | | | | | Адмовілісь ад выезду | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго. эвакуіравана | Чл. сямей | Польскіх | Чл. сямей | Яўрэйскіх | Чл. сямей | Мужчын | Жанчын | Дзяцей да 16 год | Сялян | Рабочых | Кустароў | Служачых | настаўнікаў | урачоў | ІТР | святароў | Чыгуначнікаў | Іншых | гаспадарак | Членаў сямей |
| Гродна | 6134 | 14426 | 6033 | 14256 | 101 | 170 | 3983 | 6177 | 4266 | 641 | 2800 | 419 | 812 | 152 | 34 | 86 | 19 | 148 | 5049 | 2312 | 6140 |
| Гродненскі | 2043 | 5462 | 2029 | 5432 | 14 | 30 | 1794 | 1797 | 1871 | 1779 | 503 | 149 | 53 | 38 | 4 | | 6 | 81 | 973 | 5130 | 17997 |
| Сапоцкінскі | 857 | 2252 | 856 | 2250 | 1 | 2 | 711 | 761 | 780 | 308 | 457 | 128 | 52 | 37 | 5 | 2 | | 2 | 481 | 2039 | 9411 |
| Скідзельскі | 582 | 1799 | 575 | 1785 | 7 | 14 | 427 | 611 | 761 | 326 | 220 | 85 | 45 | 15 | 2 | | | 7 | 337 | 1018 | 3799 |
| Лідскі і горад | 3586 | 10276 | 3355 | 9761 | 231 | 506 | 3302 | 3617 | 3348 | 559 | 1034 | 179 | 461 | 65 | 65 | 47 | 10 | 199 | 4300 | 4783 | 14840 |
| Жалудоцкі | 753 | 1982 | 742 | 1962 | 11 | 20 | 570 | 704 | 708 | 685 | 101 | 132 | 49 | 13 | 10 | 4 | | 19 | 261 | 2237 | 6757 |
| Шчучынскі | 1287 | 3884 | 1259 | 3840 | 28 | 44 | 1087 | 1442 | 1155 | 1126 | 231 | 227 | 182 | 78 | 6 | 5 | 3 | 16 | 455 | 3155 | 11494 |
| Радунскі | 773 | 2273 | 744 | 2207 | 29 | 66 | 425 | 799 | 716 | 990 | 102 | 126 | 61 | 27 | 4 | 4 | 2 | 17 | 224 | 2319 | 8978 |
| Васілішкаўскі | 512 | 1187 | 505 | 1177 | 7 | 10 | 1167 | 415 | 347 | 391 | 90 | 57 | 38 | 24 | 2 | 1 | 2 | | 235 | 1791 | 5515 |
| Воранаўскі | 1248 | 3522 | 1202 | 3412 | 46 | 110 | 325 | 1212 | 1143 | 439 | 188 | 303 | 107 | 30 | 9 | 11 | 6 | 42 | 1244 | 4394 | 16739 |
| Бераставіцкі | 413 | 1385 | 413 | 1385 | | | 535 | 452 | 608 | 294 | 29 | 41 | 14 | 10 | 1 | 1 | 2 | 5 | 380 | 573 | 1435 |
| Мастоўскі | 613 | 2082 | 610 | 2074 | 3 | 8 | 593 | 694 | 853 | 183 | 223 | 112 | 41 | 21 | 2 | 8 | 1 | 12 | 626 | 1011 | 4433 |
| Зельвенскі | 711 | 2068 | 678 | 2000 | 33 | 68 | 2692 | 692 | 783 | 367 | 49 | 93 | 48 | 29 | 3 | 5 | 1 | 18 | 672 | 761 | 2746 |
| Ваўкавыскі | 3156 | 3963 | 3142 | 8948 | 14 | 15 | 713 | 3403 | 2863 | 705 | 604 | 439 | 445 | 103 | 17 | 59 | 9 | 436 | 3278 | 3377 | 11237 |
| Свіслацкі | 843 | 3150 | 840 | 3146 | 3 | 4 | 631 | 1010 | 1427 | 658 | 55 | 45 | 39 | 17 | 3 | 2 | 1 | 9 | 894 | 657 | 2254 |
| Поразаўскі | 672 | 2416 | 671 | 2415 | 1 | 1 | | 713 | 1072 | 479 | 35 | 71 | 30 | 22 | 2 | | 2 | 3 | 700 | 708 | 1963 |
| Усяго: | 24183 | 67118 | 23654 | 66050 | 529 | 1068 | 19713 | 24299 | 23106 | 9930 | 6721 | 2606 | 2482 | 681 | 169 | 236 | 64 | 1014 | 20109 | 36365 | 125738 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ